УДК 372.811.161.3

# ЭТАПЫ АРГАНІЗАЦЫІ ДАСЛЕДЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ШКОЛЬНІКАЎ ПА ВУЧЭБНЫМ ПРАДМЕЦЕ "БЕЛАРУСКАЯ МОВА"

**Доўгаль Алеся Валер'еўна**
дацэнт кафедры тэарэтычнай і прыкладной лінгвістыкі
ўстановы адукацыі "Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова";
кандыдат філалагічных навук, дацэнт
(г. Магілёў, Беларусь)

Даследчая дзейнасць з'яўляецца адным з эфектыўных відаў працы па стымуляванні вучняў да самастойнага здабывання новых ведаў, выпрацоўцы навыкаў аналітычнага мыслення, фарміравання адказнасці за атрыманыя вынікі, развіцця камунікатыўных якасцей асобы (уменняў прыцягнуць увагу публікі, весці дыялог, абгрунтавана выказваць сваю пазіцыю, слухаць іншых, дарэчна выкарыстоўваць жэсты і міміку), фарміравання ўменняў працаваць з камп'ютарнымі праграмамі і інтэрнэт-рэсурсамі. Даследчая праца патрабуе ад педагога сур'ёзных намаганняў па стварэнні ўмоў для плённай сумеснай пазнавальнай дзейнасці з вучнямі. Акрамя інфармацыйных рэсурсаў, неабходныя метадычная падрыхтоўка настаўніка да правядзення даследчай работы, навыкі аказання псіхолага-педагагічнай дапамогі, а таксама пэўная матэрыяльна-тэхнічная база ўстановы адукацыі (напрыклад, магчымасць свабоднага карыстання інтэрнэт-рэсурсамі, якія сёння кампенсуюць адсутнасць неабходных літаратурных крыніц у бібліятэках школ).

Вядома, што даследчая дзейнасць выходзіць за межы школьнай праграмы, але грунтуецца на атрыманых на ўроках ведах. У прыватнасці, на занятках па беларускай мове вучні знаёмяцца з сучасным станам яе развіцця, засвойваюць асноўныя лінгвістычныя паняцці, вучацца ўжываць мовазнаўчыя тэрміны ў маўленні, прымяняць атрыманыя тэарэтычныя веды на практыцы пры выкананні заданняў у класе і дома. Для таго, каб цікава і карысна арганізаваць даследчую дзейнасць школьнікаў па-за заняткамі, настаўнік павінен быць перадусім дасведчаным лінгвістам у галіне беларускай мовы, чытаць спецыяльную навуковую і метадычную літаратуру, быць творчай асобай, якая здольная пастаянна падтрымліваць цікаўнасць да свайго прадмета. Варта помніць, што даследчая дзейнасць навучэнцаў "павінна будавацца на логіцы правядзення класічнага навуковага даследавання, з выкарыстаннем усіх метадаў і прыёмаў навуковага даследавання, характэрных для дзейнасці вучоных" [1]. У такім выпадку настаўнік сумяшчае ролі педагога і навукоўца.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Разгледзім асноўныя этапы арганізацыі даследчай дзейнасці школьнікаў па вучэбным прадмеце "Беларуская мова".

1. Вызначэнне тэмы даследавання. На гэтым этапе праяўляецца кампетэнтнасць настаўніка-кіраўніка, менавіта ад яго навуковай спрактыкаванасці залежыць выбар тэмы, якая павінна адпавядаць пэўным патрабаванням. Актуальнасць адлюстроўвае значымасць, важнасць абранай праблемы для грамадства, яе сучаснасць і своечасовасць. Навізна тэмы – гэты аўтарскі погляд на пэўную праблему. Нягледзячы на творчы характар даследчай работы, тэма мусіць мець строгую навуковую фармулёўку. У ёй павінен быць названы прадмет даследавання. Як правіла, тэма для школьнага даследавання не з'яўляецца абсалютна новай. Для паспяховай даследчай дзейнасці вучням варта прапаноўваць вырашэнне такіх праблем, якія патрабуюць прымянення засвоеных ведаў для пошуку новых. Таму абраная тэма мусіць быць арыгінальнай, нестандартнай, нешаблоннай, а значыць, цікавай для школьнікаў.

2. Вызначэнне аб'екта і прадмета даследавання. Аб'ект і прадмет даследавання як навуковыя катэгорыі суадносяцца як агульнае і прыватнае. Калі аб'ект даследавання – гэта з'ява, якая падлягае навуковаму вывучэнню, то прадмет – гэта асобныя ўласцівасці, характарыстыкі аб'екта, якія цікавяць даследчыка ў абранай з'яве. Так, напрыклад, аб'ектам можа быць мова мастацкага тэксту, а прадметам – сродкі стварэння вобразнасці; аб'ектам могуць стаць фразеалагізмы, а прадметам – іх семантычныя асаблівасці.

3. Фармулёўка мэты і задач даследавання. Мэта даследавання – гэта мяркуемы вынік працы, тое, што даследчык павінен вызначыць, выявіць, устанавіць, разгледзець, даказаць. Мэта ў рабоце заўсёды адна, але ёсць шляхі яе дасягнення, якія канкрэтызуюцца ў задачах, якія мусяць адпавядаць пастаўленай мэце, не выходзіць за яе межы і быць яе лагічнымі складнікамі. Сярод задач можна вылучыць тэарэтычныя, звязаныя з абагульненнем і сістэматызацыяй тэарэтычных дадзеных па абранай праблеме, і практычныя, скіраваныя на аналіз прадмета даследавання з дапамогай неабходных метадаў.

4. Падбор літаратуры па тэме даследавання. Галоўная роля на гэтым этапе належыць настаўніку, які арыентуецца ў вялікай колькасці літаратуры па тэме і можа выбраць тыя крыніцы, што будуць адпавядаць узросту і падрыхтаванасці школьнікаў. Літаратурныя крыніцы дазваляюць высветліць ступень распрацаванасці тэмы даследавання і вызначыць напрамкі ўласнага даследавання. Аб'ём выкарыстанай літаратуры павінен быць пасільным для вучня, таму для школьнай даследчай работы можна абмежавацца 7–10 крыніцамі.

5. Збор фактычнага матэрыялу. Матэрыялам для даследчых работ па беларускай мове з'яўляюцца разнастайныя моўныя і маўленчыя адзінкі: марфемы, словы, словазлучэнні, сказы, тэксты. Крыніцамі фактычнага матэрыялу могуць стаць слоўнікі, тэксты розных стыляў і жанраў і пад. Фактычны матэ-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

рыял можа захоўвацца ў выглядзе картак, электронных табліц, электронных спісаў і пад.

6. Вызначэнне метадаў апрацоўкі фактычнага матэрыялу. Пад метадамі разумеюцца спосабы вывучэння фактычнага матэрыялу. Метады даследавання павінны быць даступныя і зразумелыя школьнікам. Да асноўных метадаў апрацоўкі моўнага матэрыялу адносяцца апісанне, класіфікацыя, супастаўленне, розныя віды моўнага аналізу (этымалагічны, марфемны, сінтаксічны і інш.), анкетаванне, эксперымент. Гэтыя метады аналізу фактычнага матэрыялу спалучаюцца з метадам колькасных падлікаў, які дазваляе зрабіць высновы больш абгрунтаванымі і пераканаўчымі. Вынікі аналізу фактычнага матэрыялу можна падаць праз табліцы, схемы, малюнкі, дыяграмы і пад.

7. Абмеркаванне вынікаў і фармулёўка высноў. Апрацаваны фактычны матэрыял дазваляе зрабіць высновы адносна дасягнення пастаўленай мэты і выканання задач. На аснове атрыманых фактаў фармулююцца высновы, якія суадносяцца з задачамі, падмацоўваюцца моўнымі прыкладамі і колькаснымі падлікамі.

8. Афармленне тэксту даследчай работы. Тэкст даследчай работы мае наступную структуру: тытульная старонка, змест, уводзіны, асноўная частка (главы, раздзелы, падраздзелы), заключэнне, спіс выкарыстаных крыніц, дадаткі. Аб'ём даследчай работы (без уліку дадаткаў) складае 20 старонак, дадаткі павінны займаць да 10 старонак.

9. Падрыхтоўка да абмеркавання вынікаў даследчай работы. Гэты этап уключае два віды работы: падрыхтоўку тэксту выступлення, у якім будуць выкладзены асноўныя вынікі даследчай работы, і афармленне прэзентацыі вынікаў (з выкарыстаннем праграмы Power Point).

10. Публічная абарона даследчай работы. Яна можа ажыццяўляцца як на спецыяльна арганізаваных семінарах ва ўстанове адукацыі, так і на конкурсах работ даследчага характару (гарадскіх / раённых, абласных, рэспубліканскіх).

Такім чынам, удзел у даследчай дзейнасці дазваляе вучням актыўна ўключацца ў пазнавальную дзейнасць, адчуваць далучанасць да навуковых адкрыццяў, набываць самастойна новыя веды і ўласны жыццёвы вопыт, што, безумоўна, будзе спрыяць паспяховай самарэалізацыі ў грамадстве.

**Літаратура**

1. Лукьянова, Т. С. Исследовательский метод обучения – эффективный способ развития творчества учащихся [Электронный ресурс] / Т. С. Лукьянова // Научные исследования в образовании. – 2011. – № 8. – Режим доступа : http://cyberleninka.ru/article/n/issledovatelskiy-metod-obucheniya-effektivnyy-sposob-razvitiya-tvorchestva-uchaschihsya. – Дата доступа : 03.05.2017.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова